# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# ПАЗНАЮ Я ІХ ПА ГАЛАСАХ

## Беларускія ўдзельнікі дзіцячага «Еўрабачання» — учора і сёння

**Сёлета Беларусь 14-ы раз прысутнічае на міжнародным дзіцячым песенным конкурсе «Еўрабачанне». Літаральна днямі прадстаўнікі нашай краіны ўзялі ўдзел у арганізацыйнай нарадзе разам з тэлекампаніямі іншых краін — удзельніц конкурсу, дзе былі абвешчаны чарговыя змены ў фармаце музычнага форуму. Так, шоу канчаткова ператварылася з дзіцячага ў цінейджарскае: узроставыя межы для канкурсантаў звузіліся з 9 да 14 гадоў. Прытым для кожнага ўдзельніка дзіцячага «Еўрабачання-2016» прадугледжаны асобны настаўнік з ліку папярэдніх канкурсантаў, якія цягам тыдня будуць узмоцнена рыхтавацца да паспяховага выступлення. Таксама змяніўся з вячэрняга на дзённы час правядзення самога музычнага шоу.**
**Нарэшце, у гэтым годзе арганізатары цалкам выключылі з конкурсу глядацкае галасаванне, аддаўшы права выбару пераможцы нацыянальным журы: дзіцячаму і даросламу (па схеме 50/50).**

Тым часам, як расказалі «Звяздзе» ў Белтэлерадыёкампаніі, распачалася падрыхтоўка сёлетняга прадстаўніка Беларусі на дзіцячым «Еўрабачанні-2016», што пройдзе 20 лістапада на Мальце. Для 13-гадовага **Аляксандра Мінёнка,** які стаў пераможцам нацыянальнага адбору з песняй «Музыка маіх перамог», настаў напружаны перыяд шматлікіх інтэрв'ю, канцэртных выступленняў і штодзённых рэпетыцый: спеўных — з педагогам па вакалу Таццянай Трухан і танцавальных — з дзіцячым ансамблем «Сенсацыя». Акрамя таго, у нядаўняй анлайн-канферэнцыі на сайце медыяхолдынга www.tvr.by Саша расказаў, што ў конкурснай песні «будуць некаторыя дабаўленні» і зменіцца аранжыроўка, а нумар з выкарыстаннем сігвеяў плануецца яшчэ больш ускладніць дзеля відовішчнасці. Зрэшты, падрыхтоўка працягваецца, і ўсіх сакрэтаў беларуская творчая каманда загадзя выдаваць не збіраецца.

Мы ж напярэдадні вялізнага музычнага шоу давайце прыгадаем, куды падзеліся і кім сталі ранейшыя найбольш яркія прадстаўнікі нашай краіны.

### Першая



Музычнай «піянеркай» ад Беларусі стала 10-гадовая ўраджэнка Кобрына **Вольга Сацюк,** якая прыняла ўдзел у першым дзіцячым «Еўрабачанні» — конкурс прайшоў у 2003 годзе ў Капенгагене. Беларускамоўная песня «Танцуй» прынесла маленькай спявачцы 4-е месца з 16 магчымых — пагадзіцеся, для дэбюту вельмі нават няблага!

За 13 гадоў, што мінулі з таго часу, Воля вырасла і ў творчым, і ў самым звычайным сэнсе, скончыла Беларускі ўніверсітэт культуры і мастацтваў, шмат дзе спрабавала сябе на эстрадзе (напрыклад, пэўны час з'яўлялася салісткай у вядомым гурце «Краскі»), а таксама як мастачка, аўтарка песень і тэлевядучая. Цяпер Воля ў якасці дыпламаванай спецыялісткі працуе педагогам па вакале ў рок-школе Discovery, працягвае сур'ёзна займацца музыкай і не выключае свайго ўдзелу ў дарослым «Еўрабачанні». Зусім нядаўна, дарэчы, артыстка прэзентавала новы беларускамоўны музычны кліп «Анёл», зняты яшчэ адным экс-удзельнікам дзіцячага «Еўрабачання» Аляксеем Жыгалковічам.



### Самыя паспяховыя

Ужо ў 2005 годзе здарылася першая, без перабольшання сенсацыйная, перамога Беларусі на дзіцячым «Еўрабачанні» — конкурсную сцэну лёгка заваявала ўраджэнка Мазыра, «цуд з хвосцікамі» 10-гадовая **Ксенія Сітнік.** Немудрагелісты прыпеў з трох гукаў «О-а-о» яе песні «Мы разам» гучаў тады, шчыра кажучы, літаральна з кожнага праса, а правінцыйная юная артыстка вокамгненна стала больш папулярнай, чым некаторыя дарослыя калегі-выканаўцы з вялікім стажам.



За мінулыя гады Ксенія выпусціла два сольныя альбомы і некалькі кліпаў, знялася ў мюзікле, была вядучай асобнай тэлепраграмы — дзіцячага хіт-парада. Акрамя таго, дзяўчына на «выдатна» скончыла сталічную гімназію, вучылася ў Оксфардзе, праходзіла стажыроўку ў Іспаніі і нарэшце паступіла ў міжнародны інстытут у Празе — дзе, між іншым, атрымлівае прафесію журналіста, каб умець не толькі бліскуча раздаваць інтэрв'ю, але і браць іх. «Чыстым» вакалам дзяўчына сёння не займаецца, але намякае, што ёсць пэўныя планы рэалізацыі ў гэтым кірунку.



У 2007 годзе Беларусь зноў гучна заявіла аб сабе ў Ратэрдаме — дзякуючы **Аляксею Жыгалковічу** і яго перамозе «З сябрамі» (менавіта так называлася конкурсная песня для дзіцячага «Еўрабачання»).



Праз пэўны час Аляксей перажыў ломку голасу, перахварэў на падлеткавую «зорнасць», наогул пасталеў і адышоў ад музыкі, выбраўшы іншую творчую прафесію — рэжысёрскую. Хлопец вучыцца ў Акадэміі мастацтваў менавіта па гэтай спецыяльнасці — і паралельна шмат практыкуецца: здымае кліпы, камерцыйныя ролікі і нават свой кароткаметражны фільм «Патрыманы аўтамабіль». Больш за тое, малады чалавек адкрыў уласную відэастудыю AZ Video, якая за некалькі гадоў назапасіла значнае партфоліа.



### Эпатажны

2009 год. Звыклае цячэнне нацыянальнага беларускага адбору на дзіцячае «Еўрабачанне» літаральна ўзарваў худзенькі ўсмешлівы бялявы хлопчык — 12-гадовы **Юра Дземідовіч** з незвычайнай песняй «Чароўны трусік». Рэакцыя гледачоў была неадназначнай і надзвычай бурнай: у музычным заклінанні «Эціс, аціс, анімаціс» адны ўгледзелі сувязь з «Алісай у краіне цудаў» і ўсяляк захапляліся таленавітым хлопцам, другія ж убачылі хіба не акультны рытуал і жорстка крытыкавалі юнага выканаўцу... На міжнародным конкурсе ў выніку Юра Дземідовіч заняў 9 месца, але назаўжды застаўся ў гісторыі дзіцячага «Еўрабачання» як адзін з самых яркіх і папулярных удзельнікаў: на песню пра чароўнага трусіка, які «малюе крэйдай нолік» і «па маме сумуе», рабіліся неверагодныя аранжыроўкі, нумар шмат парадыравалі, здымалі і малявалі коміксы, а самога Юру запрашалі выступаць у Маскве і ўгаворвалі развівацца ў жанры музычнага эпатажу далей.





Але хлопец, хоць і выпусціў у 2010 годзе дыск «Хто б вы думалі?!», павёў сябе больш разумна за некаторых дарослых: убачыўшы неадэкватную рэакцыю многіх слухачоў, Юра афіцыйна абвясціў аб адмове ад выканання нашумелай песні, таксама забракаваў і здымкі ў беларускім фільме жахаў «Масакра» і ўвогуле зрабіў працяглую сцэнічную паўзу, звязаную з мутацыяй голасу. Сёлета Юру спаўняецца 20 гадоў. Ён скончыў гімназію-каледж пры Акадэміі музыкі (аддзяленне харавога дырыжыравання), паступіў у Маскоўскую кансерваторыю імя Чайкоўскага і, адпаведна, апошнія два гады жыве ў Маскве, дзе шчыльна займаецца любімай музыкай.

### Пачэсны



**Даніілу Казлову,** самаму малодшаму і, бадай, самаму творчаму сыну са шматдзетнай сям'і з Жабінкі, выпала няпростая місія. Ён не толькі прадстаўляў нашу краіну на музычным конкурсе 2010 года, але выступіў своеасаблівым сімвалам Беларусі як вельмі адкрытай, дружалюбнай, адначасова ўтульнай і ў той жа час неабсяжнай краіны з адметнымі культурнымі традыцыямі. Справа ў тым, што менавіта ў 2010 годзе конкурс праходзіў у беларускай сталіцы і, па водгуках еўрапейскіх арганізатараў, стаў адным з самых якасных і «фантастычных шоу». Данііл справіўся і з роляй гасціннага гаспадара, і з роляй канкурсанта, заняўшы выніковае 5-е месца.



У 2011 годзе юнак выпусціў дэбютны альбом хрысціянскай музыкі «Напачатку...» і прадоўжыў развівацца ў выбранай сферы. Сёння Данііл вучыцца ў Беларускім музычным каледжы імя Шырмы, шмат выступае, запісвае новыя песні і ўдзельнічае ў разнастайных музычных праектах.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Фота БЕЛТА, з архіва выканаўцаў і сацыяльных сетак.**

### ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

У рэйтынгу краін — удзельніц дзіцячага «Еўрабачання» Беларусь — безумоўная лідарка. На рахунку нашых артыстаў два першыя, адно другое і два трэція месцы.

Акрамя Беларусі, двойчы перамагалі на «Еўрабачанні» прадстаўнікі Мальты і Грузіі. Дарэчы, Мальта летась паставіла рэкорд па колькасці набраных балаў — 185.

З моманту заснавання дзіцячага конкурсу ўдзел у ім у розны час прымалі 37 краін.


«ХАЙ ЗІМА БУДЗЕ ЦЁПЛАЙ!»

КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»

на IV квартал або II паўгоддзе 2016 года, запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце

ДА 11 КАСТРЫЧНІКА 2016 ГОДА

ў рэдакцыю на адрас:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

бензапіла ланцуговая Husqvarna

сякера-калун Startul SE2021-10

Сярод падпісчыкаў 14.10.2016 года будуць разыграны 7 сякер-калуноў Startul і суперпрыз — бензапіла ланцуговая Husqvarna. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24.10.2016 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.12.2016 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2016 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Хай зіма будзе цёплай!» чытайце ў нумары 172 газеты «Звязда» ад 07.09.2016 г.

Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.

ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 08.09.2016 ПА 31.12.2016.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2818 ад 01.09.2016 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал 2016 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
на IV квартал 2016 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ________ (індэкс)

Удачы ў розыгрышы!


РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ